**А. Івасюк**

## БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ Ў ПАЎСТАННІ 1863–64 гг.

Падрыхтоўкай паўстання на беларускіх землях з восені 1861 г. займаўся «Камітэт руху», які са стварэннем Цэнтральнага нацыянальнага камітэту ў Варшаве увайшоў да яго ў падпарадкаванне і быў ператвораны ў Літоўскі правінцыйны камітэт. ЦНК прызначыў сваім камісарам пры ЛПК Н. Дзюлёрана.

Аднак у кастрычніку 1862 г. ЛПК узначаліў К. Каліноўскі, які выступаў за раўнапраўе ва ўзаемаадносінах з Варшаўскім цэнтрам. Ён адстойваў перадачу сялянам усёй апрацоўванай зямлі і права беларускага народа на самавызначэнне.

Згодна з тэкстам «Мужыцкай праўды» галоўнымі праблемамі народа Каліноўскі бачыў менавіта яго залежнасць ад улад, неабходнасць плаціць падаткі «маскалю» і служыць у арміі чужой краіны з-за ўвода рэкрутчыны. Газета пісалася беларускай лацінкай, што сведчыла пра яе арыентанавансць менавіта на беларускамоўны народ.

Каліноўскі разумеў, што свабоду Беларусі нельга заваяваць без саюзу с Польшчай. Але ён выступаў за незалежнасць Літвы і Беларусі і не хацеў падначаліцца Часоваму Нацыянальнаму ўраду у Варшаве.

Уладамі на задушэнне паўстання было кінута вялікае войска. Многія кіраўнікі паўстання былі забіты ў баях або пакараны смерцю. Тады Аддзел кіравання выклікаў Каліноўскага ў Вільню і ён фактычна ўзначаліў паўстанне.

Як і раней, Каліноўскі выступаў за сацыяльную рэвалюцыю, а таксама самастойнасць Літвы і Беларусі. Паўстанцы выкарыстоўвалі патрыятычны пароль: «Каго любіш?» – «Люблю Беларусь». – «Так узаемна». Гэта падкрэслівала асобнасць Беларусі ад Польшчы, вылучала яе ў самастойную краіну.

Пасля арышту Я. Гейштара Каліноўскі зноў узначаліў Аддзел кіравання правінцыямі Літвы, які был ператтвораны ў Выканаўчы аддзел Літвы, а 10 жніўня ён стаў яшчэ камісарам ЦНК у Вільне. Аднак дамагчыся пералому ў паўстанні ён ужо не мог: да пачатку верасня 1863 г. мяцеж на гэтай тэрыторыі было практычна задушаны, а сам Каліноўскі арыштаваны ў студзені 1864 г. і прысуджаны да пакарання смерцю.

У сваіх «Лістах з-пад шыбеніцы» Каліноўскі вылучае неабходнасць самавызначэння народу, яго незалежнасці у першую чаргу ад Імперыі. Таксама ён аддзяляе беларускі народ, падкрэслівае яго асобнасць ад польскаго.

Паўстанне 1863 г. высвятліла нацыянальную спецыфіку беларусаў, што знайшло адлюстраванне ў творах Каліноўскага і яго паплечнікаў. Яго дзейнасць азначала зараджэнне беларускага нацыянальнай самасвядомасці. У канчатковым выніку рэакцыя царскіх уладаў на паўстанне стварыла перадумовы для развіцця беларускага нацыяналізму.